Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі
Фрунзенскага раёна г.Мінска “Зорка”

**XX РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ВЫСТАВА**
**НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ ЛІТАРАТУРЫ,**
**ПЕДАГАГІЧНАГА ВОПЫТУ І ТВОРЧАСЦІ НАВУЧЭНСКАЙ МОЛАДЗІ**

Намінацыя
**“Выхаваўчая прастора**
**ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі”**

# “АДКРЫТЫ ФЕСТЫВАЛЬ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ “ОЙРА”: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ”

**(з вопыту дзейнасці)**

**Кіраўнік:**
**Бетлей Ірына Мікалаеўна**,
дырэктар
**Аўтары:**
**Бахмет Анастасія Уладзіміраўна**,
загадчык аддзяленем дадатковай адукацыі,
педагог дадатковай адукацыі вышэйшай
кваліфікацыйнай катэгорыі
**Халадзінская Ірына Аляксееўна**,
метадыст другой кваліфікацыйнай катэгорыі

Мінск, 2023

# АНАТАЦЫЯ

Дадзеныя метадычныя матэрыялы ўяўляюць сабой трансляцыю вопыту стварэння выхаваўчай прасторы праз конкурсна-фестывальны рух, далучэнне дзяцей і моладзі да традыцый і культуры нашай краіны на базе дзяржаўнай установы адукацыі “Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна г. Мінска “Зорка”.

Унікальнасць прадстаўленага матэрыялу заключаецца ў дэманстрацыі вопыту аб’яднання па інтарэсах розных відаў мастацтва (інструментальнага, вакальна-харавога, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, тэатральнага) у рамках адкрытага раённага фестывалю-конкурсу народнай творчасці “Ойра”, які з’яўляецца платформай для паспяховай рэалізацыі духоўна-маральнага і грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

Дадзены вопыт работы будзе карысны педагогам мастацкага профілю ўстаноў агульнай сярэдняй, сярэдне-спецыяльнай, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, установамі адукацыі ў сферы культуры, а таксама спецыялістам, якія маюць дачыненне да мастацтва.

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ
АДКРЫТЫ ФЕСТЫВАЛЬ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ “ОЙРА”: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ
ЗАКЛЮЧЭННЕ
СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ
ДАДАТКІ
Дадатак 1. Палажэнне IV адкрытага фестывалю народнай творчасці “Ойра”-2022
Дадатак 2. Палажэнне IV конкурсу народнай творчасці “Ойра”-2022 (інструментальная творчасць)
Дадатак 3. Палажэнне IV конкурсу народнай творчасці “Ойра”-2022 (вакальная творчасць)
Дадатак 4. Палажэнне IV конкурсу народнай творчасці “Ойра”-2022 (харэаграфічная творчасць)
Дадатак 5. Палажэнне IV конкурсу народнай творчасці “Ойра”-2022 (выяўленчая і дэкаратыўна-прыкладная творчасць)
Дадатак 6. Палажэнне IV конкурсу народнай творчасці “Ойра”-2022 (тэатральная творчасць)
Дадатак 7. Маніторынг
Дадатак 8. Фотогалерэя IV адкрытага фестывалю народнай творчасці “Ойра”-2022

# УВОДЗІНЫ

“Народная творчасць наогул,
а беларуская народная творчасць увасобку –
гэта мора, якое хавае сабе незлічоныя скарбы.
Толькі трэба ўмець гэтыя скарбы дастаць”
*Уладзімір Караткевіч, беларускі пісьменік*

“Беларусь сёння - цытадэль традыцыйнай культуры і маралі.
Так будзе заўсёды”.
*Аляксандр Лукашэнка, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь*

Сучасны свет дыктуе асаблівыя адносіны да гістарычнага мінулага нашай краіны, што з’яўляецца неабходным разглядаць народныя традыцыі, фальклор, мову, дэкаратыўна-прыкладное і выяўленчае мастацтва Рэспублікі Беларусь праз прызму культурнай спадчыны.

Глыбокае і ўсебаковае вывучэнне народнай творчасці роднага краю – найпершае і найглыбейшае самавыяўленне народнай душы. Менавіта гэта дае магчымасць звярнуцца да вытокаў нацыянальнай самасвядомасці, гістарычнага вопыту народа і дапамагае больш аб’ектыўна ацэньваць сваю гісторыю і правільна арыентавацца ў сучасных рэаліях.

Зварот да культурнай спадчыны ў дзяржаўнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь заўсёды актуальны. Вялікі акцэнт дадзенаму напрамку быў абазначаны і ў Год культуры (2016 г.), і ў Год малой Радзімы (2018-2020 гг.), і ў Год гістарычнай памяці (2022 г.), які дапамагае вырашыць адно з вострых пытанняў чалавечага жыцця: пераадоленне сілы адчужэння, раз’яднанасці быцця чалавека ў сучасным свеце, фарміраванне правільнага здаровага светапогляда маладога пакалення на гісторыю, культуру, традыцыі роднага краю праз разнастайныя віды творчай і грамадскай дзейнасці.

Далучэнне дзяцей і моладзі да традыцыйнай народнай культуры – працэс шматзадачны. Ён уключае ў сябе пераемнасць пакаленняў, адраджэнне гістарычнай памяці, аднаўленне страчаных традыцыйных форм адпачынку, свят, абраднасці, развіцце нацыянальнай культуры, нацыяльна-патрыятычны аспект выхавання, а таксама ўмацаванне згуртаванасці і адзінства грамадзян.

Стварэнне выхаваўчай прасторы на аснове традыцыйнай беларускай культуры з'яўляецца адной з асноўных задач ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

У дзяржаўнай установе адукацыі "Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна г.Мінска "Зорка" (далей – цэнтр "Зорка") арганізована адукацыйная і выхаваўчая прастора, якая аб'ядноўвае ўдзельнікаў творчай дзейнасці на аснове каштоўнасцей беларускай народнай культуры. І яскравым прыкладам дадзенай дзейнасці стала стварэнне ў 2016 годзе адкрытага фестываля народнай творчасці "Ойра" (далей – фестываль "Ойра").

Мэтай стварэння фестывалю "Ойра" з'яўляецца далучэнне да беларускай культуры дзяцей і моладзі, папулярызацыя народнай творчасці, захаванне беларускіх гістарычных, культурных, сямейных традыцый і каштоўнасцей, адраджэнне нацыянальнай культуры.

Асноўнымі задачамі фестывалю "Ойра" з'яўляюцца:

- выхоўваць патрыятызм, талерантнасць, паважлівыя і беражлівыя адносіны да культурна-гістарычнай спадчыны;
- фарміраваць абачлівае і ўважлівае стаўленне да вырабаў, выкананымі рукамі нашых продкаў, іх мастацкага густу, жыццёвай мудрасці, майстровым навыкам і ўменням;
- прывіваць культуру зносін на аснове спасціжэння традыцый і звычаяў рэгіёнаў Беларусі;
- павышаць цікавасць і творчую актыўнасць дзіцяча-юнацкіх калектываў у засваенні разнастайных формаў традыцыйнай народнай культуры;
- выяўляць і падтрымліваць таленавітых дзяцей і падлеткаў, яркія творчыя калектывы;

– знаёміць і ўмацоўваць творчае супрацоўніцтва паміж творчымі калектывамі, удзельнікамі, установамі адукацыі і культуры.

## АДКРЫТЫ ФЕСТЫВАЛЬ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ “ОЙРА”: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

Назва фестываля “Ойра” паходзіць ад назвы парнага побытавага танца “Ойра-ойра”, які з’явіўся на Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Звычайна танец выконваюць парамі, утвараючы вялікі круг. Асоба варта адзначыць кампазыцыйны прыём “ойры”. Ён звязаны са зменай партнёраў. Сам прыём даволі вядомы ў народнай харэаграфіі і нацэльны на маладых. Змена партнёра на працягу ўсяго танца дае максімальную магчымасць пазнаёміцца адзін з адным. На працягу танца выкарыстоўваецца эмацыйны вокліч “ойра”. Асаблівая папулярнасць “ойры” у моладзевым асяроддзі тлумачыцца яе вясёлым характарам.

Фестываль складаецца з невялікіх тэматычных конкурсаў па розных напрамках (інструментальная, вакальная, харэаграфічная, тэатральная, выяўленчая і дэкаратыўна-прыкладная творчасць) з аднайменнай назвай “Ойра” (*Дадатак 2-6*) і з’яўляецца адзінай выхаваўчай прасторай, якая аб’ядноўвае ўсе накірункі творчай дзейнасці цэнтра “Зорка” (*Дадатак 1*).

Праводзіцца фестываль “Ойра” адзін раз ў два гады: менавіта такі тэрмін спрыяе аптымальнай падрыхтоўцы ўдзельнікаў да творчага нумара. У фестывале прымаюць удзел навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй, сярэдне-спецыяльнай, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, устаноў адукацыі ў сферы культуры.

У цяперашні час, народная творчасць для сучасных аўтараў выступае як крыніца ідэй у стварэнні абсалютна новых твораў з выкарыстаннем нацыянальнага каларыту. І асаблівасцю фестываля “Ойра” з’яўляецца не толькі захаванне (капіяванне) народных традыцый і звычаяў беларусаў, але і сучаснае чытанне, апрацоўка і стылізацыя аўтэнтычных узораў (прыкладаў) народнай творчасці, што яскрава дэманструе сінтэз традыцый беларускага народа і сучасных тэндэнцый.

Адкрыты фестываль народнай творчасці “Ойра” цэнтра “Зорка” праводзіцца ў лютым на працягу тыдня і прымеркаваны да Міжнароднага дня роднай мовы – 21 лютага. Менавіта для беларусаў родная мова выступае як адзін з важных складальнікаў культурнага кода нацыі, яе патрыятычнага выхавання, а таксама сімвала нацыянальнай самасвядомасці і гістарычнай памяці.

У гэты тыдзень у цэнтры “Зорка” пануе атмасфера беларускай культуры. Фестываль – гэта асяроддзе нацыянальнага каларыту, дзе ўдзельнікі і супрацоўнікі ўстановы дадатковай адукацыі размаўляюць на беларускай мове; усе выступленні і ход праграмы вядуцца на роднай мове; педагогі дадатковай адукацыі размаўляюць як з навучэнцамі, так і законнымі прадстаўнікамі на мове сваіх продкаў.

Кожны фестывальны дзень прысвечаны адпаведнаму творчаму напрамку. Пачынаецца фестываль “Ойра” з адкрыцця выставы конкурсных работ выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці ў наступных намінацыях: “Жывапіс” (выявы беларускага інтэр’ера, пейзажа, нацюрморта і г.д.); “Тэкстыльны дызайн” (ткацтва, тэкстыльнае пано, вышыўка, габелен, маляванкі, макаткі, кухонныя вырабы: сурвэткі, абрусы, прыхваткі, ручнікі); “Саломапляценне” (дробныя і буйныя вырабы з саломкі, якія адлюстроўваюць розныя віды пляцення; вырабы, інкруставаныя саломкай); “Кераміка” (дробная пластыка, пано, бытавыя прадметы); “Разьба па дрэве” (розныя работы з драўніны: прадметы інтэр’ера, кухоннае начынне); “Дэкаратыўная кампазіцыя” (пано з выкарыстаннем беларускага арнаменту, кампазіцыі з букетаў, вянкі і інш.).

Таксама ў першы дзень фестывальнага тыдня праходзіць конкурс чытальнікаў (тэатральная творчасць). Дэвіз конкурсу – “Гучы, беларускае слова!”, што вельмі сімвалічна ў свята Міжнароднага дня роднай мовы. Мэтай конкурсу з’яўляецца стварэнне ўмоў для выяўлення і развіцця творчых здольнасцей дзяцей у жанры мастацкага слова. Удельнікам прапануецца

выступіць з творам (вершам) на беларускай мове па тэме: “Зямля мая, ты – кніга непрачытаная”.

У вакальным напрамку праходзіць выкананне твораў: фальклорных, народных, у сучаснай апрацоўцы, беларускіх аўтараў; у інструментальным напрамку – беларускіх кампазітараў і сучасных апрацовак беларускіх народных музычных твораў; у харэаграфічным – беларускіх народных і народна-стылізаваных танцаў.

Стварэнне кожнага фестывальнага твору ў розных напрамках творчасці - гэта свайго роду даследаванне, пранікненне ў нацыянальную культуру, і для навучэнцаў, і для іх педагогаў. Падрыхтоўка фестывальнага прадукта патрабуе ўважлівага вывучэння матэрыялу: будзь то мастацкі выраб ці пастаноўка танца.

Журы ацэньвае кожны творчы прадукт па ўнікальнасці і складанасці выканання, так і сцэнічнасць выявы, вытрыманасць нацыянальнага стылю і каларыт ў кожнай прадстаўленай рабоце. Таму ўдзельнікам фестывалю пры падрыхтоўцы твораў трэба дасканала вывучыць як асаблівасці выканання ў народным стылі, так і падабраць альбо стварыць адпаведны канцэртны касцюм і вобраз.

Вывучаючы гісторыю сваёй Радзімы, свайго роднага краю, рыхтуючыся да фестывалю, навучэнцы не толькі набываюць веды, але і знаёмяцца з адметнымі рысамі і характарам беларускага народа, які фарміраваўся на працягу многіх стагоддзяў.

Завяршаецца фестывальны тыдзень Гала-канцэртам, дзе прымаюць удзел усе канкурсанты і фіналісты, а таксама ўрачыстым узнагароджаннем дыпламантаў і ўдзельнікаў адкрытага фестывалю народнай творчасці “Ойра”.

Назіраць пашырэнне ўдзельнікаў фестывалю “Ойра” можна з дапамогай маніторынгавага даследавання (*Дадатак 7*). І неабходна падкрэсліць, што пачынаўся фестываль “Ойра” з некалькіх напрамкаў: інструментальны, вакальны, харэаграфічны.

Прыемна адзначыць, што арганізацыя і правядзення фестываля “Ойра” спрыяе ўсталяванню сяброўскіх і партнёрскіх сувязей паміж установамі

адукацыі і культуры Фрунзенскага раёна, горада Мінска і цэнтрам “Зорка”, што падцвярджае неабыякавасць прадстаўнікоў дадзеных устаноў да традыцыйнай беларускай культуры і асэнсаванасць велізарнага адукацыйнага і выхаваўчага патэнцыялу.

Такім чынам, агульная сумесная дзейнасць у межах фестывалю “Ойра” спрыяе творчаму і культурнаму ўзбагачэнню кожнага ўдзельніка, што станоўча адбіваецца на фарміраванні патрыятычнасці і нацыянальнай самасвядомасці прадстаўнікоў адукацыйнага асяроддзя Фрунзенскага раёна.

Дзейнасць фестывалю “Ойра” дэманструецца на афіцыйным сайце і ў сацыяльных сетках цэнтра “Зорка”.

Дадзены вопыт трансляваўся на IV гарадскіх педагагічных чытаннях у 2021 годзе, III рэспубліканскім конкурсе метадычных распрацовак “Выхаваўчая дзейнасць: ёсць ідэя!” у 2022 годзе.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Звяртаючыся да культурнага мінулага, дзякуючы сучасным кампазітарам, харэографам, выканаўцам, мастакам, якія працуюць у гэтым напрамку, народная творчасць атрымала новае духоўнае развіццё. Менавіта яны не толькі захоўваюць, але і памнажаюць, і развіваюць нацыянальную спадчыну, ахоўваючы нацыянальнае “зерне”, даючы яму новы подых. Так і дзіця, ствараючы свой творчы прадукт, апускаючыся ў вывучэнне нацыянальнай культуры, яе традыцый, можа прасачыць пераход ад вытокаў да сучаснай стылізацыі новага твора и наадварот.

Можна канстатаваць, што будучы шлях для беларускай выхаваўчай парадыгмы – ёсць шлях выхавання ў перспектыве вельмі прыстойных, развітых, патрыятычна арыентаваных дзяцей і падлеткаў. Асабліва гэта актуальна для сучаснага горада, які імкліва губляе сувязь з этнічнымі каранямі сваіх жыхароў.

Творчае адукацыйнае асяроддзе, якое існуе ў цэнтры “Зорка”, спрыяе выхаванню гарманічна развітай асобы з высокім мастацка-эстэтычным патэнцыялам, актыўнай жыццёвай пазіцыяй і нацыянальнай самасвядомасцю.

Дзейнасць фестываля “Ойра” знаходзіць свае адлюстраванне ў павелічэнні зацікаўленасці навучэнцаў, іх законных прадстаўнікоў, педагогаў да беларускай культуры, яе папулярнасці ў сацыяльным асяроддзі сталіцы.

Адкрыты фестываль народнай творчасці “Ойра” – гэта выхаваўчая платформа, якая стала сапраўдным сродкам камунікацыі, абмену вопытам паміж навучэнцамі, педагогамі і разнастайнымі фальклорнымі аб’яднаннямі і гуртамі (*Дадатак 8*). Фестываль выступае яскравым прыкладам творчага сінтэзу: ад вытокаў народных традыцый і культуры да сучасных напрамкаў мастацкай творчасці.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Беларускі фальклор : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2005.– 2 т.

2. Гілевіч, Н. Выбраныя творы: у 2 т. / Н. Гілевіч. — Мінск: Маст. літ., 1991.—Т. 1. — 478 с.

3. Катовіч, А. В. Залатыя правілы народнай культуры / А. В. Катовіч, Я. Крук. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – 592 с.

4. Крыўко, Т.М. Выхаванне на аснове традыцый беларускага народа. Беларуская народная цацка / скл. Т.М. Крыўко, Т.А, Сідарэвіч – Мінск: НЦМТДМ, 2017. – 452 с.

5. Ойра-ойра (танец) [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя. Вольная энцыклапедыя. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Ойра#:~:text=«О́йра»%20ці%20«Ойра-ойра»%20—%20парны,адкуль%20і%20паходзіць%20назва%20танцу / - Дата доступу: 06.12.2022.

6. Пятроўская, Г. А. Жывая спадчына / Г. А. Пятроўская; пад рэд. А. У. Сапун. – Мінск : Беларусь, 1988. – 79 с.

7. Титовец, А. В. Традиционная культура белорусов во времени и пространстве /А. В. Титовец [и др.]. – Минск : Белорус. наука, 2013. – 579 с.

8. Фальклор і сучасная культура. Матэрыялы III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. У 2 ч. [Электронны рэсурс] // Электронная бібліятэка БДУ. - Рэжым доступу: https://elib.bsu.by/handle/123456789/13384?locale=en / - Дата доступу: 14.12.2022.

**Дадатак 1**

**ПАЛАЖЭННЕ**

**IV АДКРЫТАГА ФЕСТЫВАЛЮ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ “ОЙРА”**

**1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

Адкрыты фестываль народнай творчасці “Ойра” (далей фестываль) праходзіць у рамках Міжнароднага дня роднай мовы.

**2. ЗАСНАВАЛЬНІКІ ФЕСТЫВАЛЮ**

Упраўленне па адукацыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска, дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна горада Мінска “Зорка”.

**3. МЭТА І ЗАДАЧЫ ФЕСТЫВАЛЮ**

Адкрыты фестываль народнай творчасці “Ойра” праводзіцца з мэтай далучэння да беларускай культуры дзяцей і моладзі, папулярызацыі народнай творчасці, захавання беларускіх гістарычных, культурных, сямейных традыцый і каштоўнасцей, адраджэння нацыянальнай культуры.

**Задачы:**

- выхоўваць патрыятызм, талерантнасць, паважлівыя і беражлівыя адносіны да культурна-гістарычнай спадчыны;
- фарміраваць абачлівае і ўважлівае стаўленне да вырабаў, выкананымі рукамі нашых продкаў, іх мастацкага густу, жыццёвай мудрасці, майстровым навыкам і ўменням;
- прывіваць культуру зносін на аснове спасціжэння традыцый і звычаяў рэгіёнаў Беларусі;
- павышаць цікавасць і творчую актыўнасць дзіцяча-юнацкіх калектываў у засваенні разнастайных формаў традыцыйнай народнай культуры;
- выяўляць і падтрымліваць таленавітых дзяцей і падлеткаў, яркія творчыя калектывы;
- знаёміць і ўмацоўваць творчае супрацоўніцтва паміж творчымі калектывамі, удзельнікамі, установамі адукацыі і культуры.

**4. КІРАЎНІЦТВА І АРГАНІЗАЦЫЯ ФЕСТЫВАЛЮ**

Ажыццяўляецца аргкамітэтам фестывалю. Аргкамітэт мае права змяніць колькасць намінацый у ходзе фестывалю.

**5. УДЗЕЛЬНІКІ ФЕСТЫВАЛЮ**

Да ўдзелу ў фестывалі запрашаюцца навучэнцы, творчыя калектывы, фальклорныя калектывы, інструментальныя і харэаграфічныя калектывы, вакальныя ансамблі і салісты ўсіх устаноў адукацыі і культуры Фрунзенскага раёна горада Мінска.

**Узрост удзельнікаў фестывалю•** ад 6 да 25 гадоў.

Тэматыка прадстаўленых нумароў павінна раскрываць агульную тэму фестывалю.

**6. ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ ФЕСТЫВАЛЮ**

Адкрыты фестываль народнай творчасці "Ойра" праходзіць ў дзяржаўнай ўстанове адукацыі "Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна горада Мінска "Зорка" па адрасу Адзінцова, 10.

Праводзіцца фестываль адзін раз ў два гады ў лютым на працягу тыдня і прымеркаваны да Міжнароднага дня роднай мовы (21 лютага). Завяршаецца фестываль гала-канцэртам.

**7. НАПРАМКІ ФЕСТЫВАЛЮ:**

- інструментальная творчасць;
- вакальная творчасць;
- харэаграфічная творчасць;
- тэтральная творчасць (конкурс чытальнікаў);
- выяўленчая і дэкаратыўна-прыкладная творчасць.

**8. НАМІНАЦЫІ ФЕСТЫВАЛЮ**

**8.1. Напрамак інструментальная творчасць:**

- салісты;
- малыя формы;
- ансамблі.

**8.2. Напрамак вакальная творчасць:**

- беларуская народная песня;
- песня беларускіх аўтараў.

**8.3. Напрамак харэаграфічная творчасць:**

- беларускі народны танец;
- беларускі народны танец у сучаснай апрацоўцы.

**8.4. Напрамак тэатральная творчасць:**

- твор (верш) на беларускай мове па тэме: «Зямля мая, ты – кніга непрачытана».

**8.5. Напрамак выяўленчая і дэкаратыўна-прыкладная творчасць:**

- жывапіс;
- тэкстыльны дызайн;
- саломапляценне;
- кераміка;
- разьба па дрэве;
- дэкаратыўная кампазіцыя.

**9. КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ**

Крытэрыі ацэнкі работ вызначаюцца ў адпаведнасці з напрамкамі фестывалю.

**10. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ ФЕСТЫВАЛЮ**

10.1. Вынікі фестывалю вызначаюцца членамі журы.

10.2. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

10.3. Журы ацэньвае выступленні ўдзельнікаў у адпаведнасці з напрамкам фестывалю і намінацыяй.

10.4. У кожнай намінацыі журы вызначае Дыпламанта І ступені, Дыпламанта ІІ ступені, Дыпламанта ІІІ ступені, Гран-пры. Журы фестывалю мае права: не прысуджаць Гран-пры; прысуджаць не ўсе дыпломы; прысуджаць некалькі дыпломаў (акрамя Гран-пры і дыплома І ступені).

10.5. Усе ўдзельнікі фестывалю ўзнагароджваюцца граматамі ДУА “Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна г. Мінска “Зорка”.

**11. КАНТАКТНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

ДУА “Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна г. Мінска “Зорка”, вул. Адзінцова, 10, каб. 208

**Дадатак 2**

**ПАЛАЖЭННЕ**
**IV конкурсу народнай творчасці “Ойра” – 2022**
**(інструментальная творчасць)**

**1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

Конкурс народнай творчасці “Ойра” з’яўляецца адным з мерапрыемстваў адкрытага фестывалю народнай творчасці “Ойра” (далей конкурс) і праходзіць у рамках Міжнароднага дня роднай мовы.

**2. ЗАСНАВАЛЬНІКІ КОНКУРСУ**

2.1. Упраўленне адукацыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна.

2.2. Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна горада Мінска “Зорка”.

**3. МЭТА І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ**

**Мэта:** папулярызацыя народнай творчасці, захаванне народных гістарычных, культурных, сямейных традыцый і каштоўнасцей, адраджэнне народнай культуры.

**Задачы:**

- выхаванне патрыятызму, талерантнасці, паважлівага і беражлівага стаўлення да культурна-гістарычнай спадчыны;
- фарміраванне культуры зносін на аснове спасціжэння традыцый і звычаяў рэгіёнаў Беларусі;
- падтрымка цікавасці і творчай актыўнасці дзіцяча-юнацкіх калектываў у засваенні разнастайных форм народнай традыцыйнай культуры, а таксама музыкі беларускіх кампазітараў;
- выяўленне і падтрымка таленавітых дзяцей і падлеткаў, яркіх творчых калектываў;
- знаёмства і ўмацаванне творчага супрацоўніцтва паміж інструментальнымі калектывамі.

**4. КІРАЎНІЦТВА І АРГАНІЗАЦЫЯ КОНКУРСУ**

Ажыццяўляецца аргкамітэтам конкурсу. Аргкамітэт мае права змяніць колькасць намінацый у ходзе конкурсу.

**5. УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ:**

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца навучэнцы, творчыя калектывы, фальклорныя калектывы, інструментальныя калектывы і салісты ўсіх устаноў адукацыі і культуры Фрунзенскага раёна, горада Мінска.

**Узроставыя катэгорыі ўдзельнікаў:**

- 6-9 гадоў;
- 10-13 гадоў;
- 14-17 гадоў;

- 18-25 гадоў;
- змешаная ўзроставая катэгорыя

**6. ЭТАПЫ І ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ:**

Конкурс народнай творчасці “Ойра” (інструментальная творчасць) будзе праходзіць у лютым 2022 года ў актавай зале ДУА ЦТМТДІМ Фрунзенскага раёна г. Мінска “Зорка”, Адзінцова, 10 **25.02.2022 у 15.00**

**Парадак і ўмовы правядзення конкурсу па накіраванні інструментальная творчасць.**

**7. НАМІНАЦЫІ КОНКУРСУ**

**Салісты.** Групы: фартэпіяна, народныя інструменты (баян, акардэон), народныя струнна-шчыпковыя інструменты (цымбалы, мандаліна, домра, балалайка, гітара і г.д.), струнна-смычковыя інструменты, духавыя інструменты, ударныя інструменты.

**Малыя формы** (да 3-х удзельнікаў).

**Ансамблі** (ад 4-х удзельнікаў).

**Тэматыка твораў:**

- інструментальная беларуская музыка народная і ў апрацоўцы;
- музыка беларускіх кампазітараў.

**Працягласць выступлення** – да 4-х хвілін, адзін твор.

**Увага!!! Ад кожнай установы прымаецца не больш за адну заяву па накіраванні.**

**Напрыклад: СШ№1: 1 заяўка фартэпіяна, 1 заяўка баян, 1 заяўка ансамбль, 1 заяўка дуэт.**

**8. КРЫТЭРЫ АЦЭНКІ:**

- строгая адпаведнасць тэматыцы конкурсу;
- выканальніцкае майстэрства (эмацыянальнасць выканання, акцёрскае майстэрства);
- сцэнічная культура;
- тэхніка выканання;
- захаванне нацыянальных асаблівасцей.

**9. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ:**

Вынікі конкурсу вызначаюцца членамі журы. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

У кожнай намінацыі журы вызначае Дыпламанта I ступені, Дыпламанта II ступені, Дыпламанта III ступені.

**Умовы конкурсу:**

Для ўдзелу ў конкурсе неабходна да 14 лютага 2022 г. даслаць заяўку (у фармаце Word!) па электроннай пошце cht-instrumusic@minsk.edu.by з паметкай (Ойра, інструментальная творчасць) СТРОГА ўстаноўленага ўзору (Дадатак № 1). Заяўкі салістаў, малых формаў і ансамбляў падаюцца асобна!

**Усе дадзеныя з заявак адлюстроўваюцца ў дыпломах у тым выглядзе, у якім яны пададзены на электронны пошту.**

Арыгінал заяўкі з подпісам дырэктара і пячаткай установы падаецца ў дзень конкурсу ў каб. 207. Удзельнікі, якія не падалі арыгінал заяўкі, да конкурсу не дапускаюцца.

**Рэпетыцыя на сцэне, кабінеты для разыгрывання перад выступленнем не прадастаўляюцца.**

**10. КАНТАКТНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Кансультацыі па пытаннях арганізацыі конкурсу і ўдзел у ім можна атрымаць у ДУА ЦТХТДіМ “Зорка” вул. Адзінцова, 10, каб. 207, тэл. 3905776, загадчык аддзялення Бахмет Анастасія Уладзіміраўна

**Дадатак 3**

**ПАЛАЖЭННЕ**
**IV конкурсу народнай творчасці “Ойра-2022”**
**(вакальная творчасць)**

**1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

Конкурс народнай творчасці “Ойра-2022” у напрамку “вакальная творчасць” з'яўляецца адным з мерапрыемстваў Адкрытага фестывалю народнай творчасці (далей конкурс) і праходзіць у рамках Міжнароднага дня роднай мовы.

**2. ЗАСНАВАЛЬНІКІ КОНКУРСУ**

2.1. Упраўленне адукацыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна.

2.2. Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна горада Мінска “Зорка”.

**3. МЭТА І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ**

**Мэта:** папулярызацыя народнай творчасці, захаванне народных, гістарычных, культурных, сямейных традыцый і каштоўнасцей, адраджэнне нацыянальнай культуры.

**Задачы:**

– выхаванне патрыятызму, паважлівых і беражлівых адносін да культурна-гістарычнай спадчыны Рэспублікі Беларусь;

– падтрымка цікавасці і творчай актыўнасці дзіцяча-юнацкіх калектываў і сольных выканаўцаў у засваенні вакальных твораў народнай традыцыйнай і нацыянальнай культуры;

– выяўленне і падтрымка таленавітых дзяцей, падлеткаў, педагогаў, яркіх творчых калектываў;

– знаёмства і ўмацаванне творчага супрацоўніцтва паміж дзіцяча-юнацкіх калектываў і сольных выканаўцаў;

– арганізацыя вольнага часу навучэнцаў і педагогаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

– стымуляванне творчай дзейнасці навучэнцаў і работнікаў устаноў адукацыі;

– стварэнне ўмоў для творчай самарэалізацыі і арганізацыі вольнага часу навучэнцаў і работнікаў устаноў адукацыі.

**4. КІРАЎНІЦТВА І АРГАНІЗАЦЫЯ КОНКУРСУ**

Ажыццяўляецца аргкамітэтам конкурсу. Аргкамітэт мае права змяніць колькасць намінацый у ходзе конкурсу.

**5. УМОВЫ КОНКУРСУ**

У конкурсе бяруць удзел салісты і вакальныя ансамблі ўстаноў агульнай сярэдняй, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, культуры Фрунзенскага раёна, горада Мінска (навучэнцы і супрацоўнікі):

**Салісты** (народны вакал, эстрадны вакал, акадэмічны вакал):

**Фальклорныя калектывы** (сцэнічны, этнаграфічны, народны вакал) - вакальна-харавыя, вакальна-харэаграфічныя, вакальна-інструментальныя;

**Ансамблі** (эстрадны, акадэмічны, да 12 чалавек)

**Узроставыя катэгорыі ўдзельнікаў:**

- 6 - 9 гадоў;
- 10 - 13 гадоў;
- 14 - 17 гадоў;
- 18 і старэй;
- змешаная ўзроставая катэгорыя.

**Ад адной установы адукацыі прымаецца не больш за 2 заявы!**

**6. НАМІНАЦЫІ КОНКУРСУ**

**Удзельнікі прадстаўляюць адзін твор (у суправаджэнні інструмента (аў), фанаграмы “мінус” або “а капэла”) у наступных намінацыях:**

– Беларуская народная песня (фальклорныя, народныя ў тым ліку ў сучаснай апрацоўцы), - да 5 нумароў ад УА (для стымулявання звароту да нар. творчасці). Нар. песні;

– Песня беларускіх аўтараў; - да 3 нумароў ад установы адукацыі, стварыць спіс з мінусамі і плюсамі+тэксты твораў бел. аўтараў.

**7. ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ**

Конкурс пройдзе 24 лютага 2022 года, у 15.00 у актавай зале ДУА ЦТМТДіМ “Зорка”, па адрасе, вул. Адзінцова, 10.

Чарговасць выступлення будзе выслана на электронную пошту ўстаноў адукацыі не пазней за 22 снежня.

**Кожны ўдзельнік прыводзіць на конкурс групу падтрымкі з 5-7 чалавек (уваход групы падтрымкі ў залу не раней, чым за паўгадзіны да пачатку конкурсу!)**

**Аб правядзенні гала-канцэрта і цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў конкурсу будзе паведамлена дадаткова.**

**8. КРЫТЭРЫ АЦЭНКІ:**

- адпаведнасць тэматыцы конкурсу;
- выканальніцкае майстэрства;
- захаванне нацыянальных асаблівасцяў;
- сцэнічная культура;
- сцэнічная выява (падача, эмацыйнасць выканання, акцёрскае майстэрства);
- арыгінальнасць, відовішчнасць нумара, сцэнічны касцюм, кампазіцыйнае і пастановачнае рашэнне;
- складанасць рэпертуару, адпаведнасць рэпертуару узроставым і выканальніцкім;
- магчымасцям канкурсанта;
- якасць суправаджэння (акампанемент, фанаграма “мінус”).

**9. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ**

Падвядзенне вынікаў конкурсу будзе праходзіць з улікам узроставых груп і захавання ўмоў гэтага становішча. Па выніках правядзення конкурсу журы вызначае ўладальнікаў дыпломаў I, II, III ступені ў кожнай намінацыі і ўзроставай катэгорыі.

Журы конкурсу мае права: не прысуджаць Гран-пры; прысуджаць не ўсе дыпломы і прэміі; прысуджаць некалькі дыпломаў (акрамя Гран-пры і дыплома I ступені).

Рашэнне журы канчатковае і абскарджанню не падлягае!

Заяўкі прымаюцца **разам з фанаграмамі,** у адным электронным лісце!

З паметкай “Заяўка на конкурс “Ойра” вакал ДУА №…” **па 18 лютага 2022 года ўключна** на электронную пошту: cht-vocal@minsk.edu.by

***Арыгінал заяўкі з подпісам дырэктара і пячаткай установы падаецца ў дзень конкурсу журы.***

***Удзельнікі, якія не падалі арыгінал заяўкі, да конкурсу не дапускаюцца.***

**Усе дадзеныя з заявак будуць адлюстроўвацца ў дыпломах у тым выглядзе, у якім яны пададзены на электронную пошту.**

**10. КАНТАКТНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Аддзел вакальна-харавой творчасці ДУА ЦТМТДіМ “Зорка”, вул. Адзінцова, 10, каб. 207; Тэл. 390-57-76. Загадчык аддзялення Канкаловіч Вольга Генадзеўна

**Дадатак 4**

**ПАЛАЖЭННЕ**
**IV конкурсу народнай творчасці “Ойра-2022”**
**(харэаграфічная творчасць)**

**1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

Конкурс народнай творчасці “Ойра” з'яўляецца адным з мерапрыемстваў Адкрытага фестывалю народнай творчасці (далей конкурс) і праходзіць у рамках Міжнароднага дня роднай мовы.

**2. ЗАСНАВАЛЬНІКІ КОНКУРСУ**

2.1. Упраўленне адукацыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна.

2.2. Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна горада Мінска “Зорка”.

**3. МЭТА І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ**

**Мэта:** папулярызацыя народнай творчасці, захаванне народных гістарычных, культурных, сямейных традыцый і каштоўнасцей, адраджэнне народнай культуры.

**Задачы:**

- выхаванне патрыятызму, талерантнасці, паважлівага і беражлівага стаўлення да культурна-гістарычнай спадчыны;
- фарміраванне культуры зносін на аснове спасціжэння традыцый і звычаяў рэгіёнаў Беларусі;
- падтрымка цікавасці і творчай актыўнасці дзіцяча-юнацкіх калектываў у засваенні разнастайных форм народнай традыцыйнай культуры;
- выяўленне і падтрымка таленавітых дзяцей і падлеткаў, яркіх творчых калектываў;
- знаёмства і ўмацаванне творчага супрацоўніцтва паміж фальклорнымі калектывамі.

**4. КІРАЎНІЦТВА І АРГАНІЗАЦЫЯ КОНКУРСУ**

Ажыццяўляецца аргкамітэтам конкурсу. Аргкамітэт мае права змяніць колькасць намінацый у ходзе конкурсу.

**5. УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ**

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца харэаграфічныя калектывы ўсіх устаноў адукацыі і культуры Фрунзенскага раёна, горада Мінска.

**Узроставыя катэгорыі ўдзельнікаў:**

- 6-9 гадоў;
- 10-13 гадоў;
- 14-18 год;
- смешанная возрастная категория.

**6. ЭТАПЫ І ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ**

Конкурс праводзіцца 23 лютага 2022 года.

**7. ПАРАДАК І ЎМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ**

Удзельнічаюць салісты, дуэты, і г.д., харэаграфічныя калектывы. Працягласць выступлення - да 5 хвілін.

***Адна ўстанова можа прадстаўляць не больш за чатыры заявкі ў кожным напрамку.***

**8. НАМІНАЦЫІ КОНКУРСУ**

Удзельнікі могуць выступаць у намінацыях:

- беларускі народны танец;
- беларускі народны танец у сучаснай апрацоўцы.

Заяўкі на ўдзел у конкурсе дзіцячай творчасці прымаюцца да 21 лютага 2022 года (Дадатак 1) па адрасе: вул. Адзінцова,10 (каб. № 207).

**Заяўкі і фанаграмы (мінус) падаюцца па электроннай пошце** cht-xiv@minsk.edu.by

**Арыгінал заяўкі з подпісам дырэктара і пячаткай установы падаецца ў дзень конкурсу ў каб. 207.**

***Удзельнікі, якія не падалі арыгінал заяўкі, да конкурсу не дапускаюцца.***

**9. КРЫТЭРЫ АЦЭНКІ:**

- строгая адпаведнасць тэматыцы конкурсу;
- выканальніцкае майстэрства (эмацыянальнасць выканання, акцёрскае майстэрства);
- сцэнічная культура;
- тэхніка выканання;
- захаванне нацыянальных асаблівасцей;
- кампазіцыйнае, пастановачнае рашэнне (драматургія нумара, малюнак танца).

**10. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ**

Вынікі конкурсу вызначаюцца членамі журы. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

Конкурс у рамках Фестывалю пройдзе ў актавай зале ДУА ЦТХТДзіМ Фрунзенскага раёна г. Мінска "Зорка" 23 лютага 2022 года ў 15.00 харэаграфічная творчасць.

У палажэнні магчымы змены!

**11. КАНТАКТНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Кансультацыі па пытаннях арганізацыі конкурсу і ўдзел у ім можна атрымаць у ДУА ЦХТДіМ "Зорка", вул. Адзінцова, 10, каб. 207, тэл. 3655776. Загадчык аддзялення Афіцэрава Ірына Уладзіміраўна.

**Дадатак 5**

**ПАЛАЖЭННЕ**
**IV конкурсу народнай творчасці “Ойра-2022”**
**(выяўленчая і дэкаратыўна-прыкладная творчасць)**

**1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

Конкурс народнай творчасці “Ойра” з'яўляецца адным з мерапрыемстваў Адкрытага фестывалю народнай творчасці (далей конкурс) і праходзіць у рамках Міжнароднага дня роднай мовы.

**2. ЗАСНАВАЛЬНІКІ КОНКУРСУ**

2.1. Упраўленне адукацыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна.

2.2. Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна горада Мінска “Зорка”.

**3. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ**

3.1. Конкурс праводзіцца з мэтай папулярызацыі народнай творчасці, далучэння навучэнцаў да эстэтычнага і маральнага вопыту, назапашанага беларускім народам у галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, знаёмства з рознымі відамі рамеснай дзейнасці нашых продкаў, актуалізацыя нацыянальных традыцый Беларусі.

3.2. Задачамі конкурсу з'яўляюцца:

- выхаванне беражлівых адносін да культурна-гістарычнай спадчыны;
- актывізацыя дапытлівасці і далучэнне навучэнцаў да нацыянальнай культуры і традыцый беларускага народа;
- чулыя і паважлівыя адносіны да вырабаў, выкананых рукамі нашых продкаў, іх мастацкага густу, жыццёвай мудрасці, майстравых навыкаў і ўменняў;
- выяўленне і падтрымка таленавітых дзяцей і падлеткаў у сферы мастацкай творчасці, іх заахвочванне і прадастаўленне ім магчымасці прадэманстраваць свае лепшыя творчыя работы.

**4. КІРАЎНІЦТВА І АРГАНІЗАЦЫЯ КОНКУРСУ**

Ажыццяўляюцца аргкамітэтам конкурсу. Аргкамітэт мае права змяніць колькасць намінацый у ходзе конкурсу.

**5. УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ**

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца навучэнцы (або калектывы навучэнцаў) усіх устаноў адукацыі і культуры Фрунзенскага раёна, горада Мінска ад 6 да 17 гадоў **у трох узроставых катэгорыях:**

**6-9 год, 10-13 год, 14-17 год.**

Ад кожнай установы адукацыі прымаюцца не больш за 3 лепшыя работы (у кожнай узроставай катэгорыі).

**6. УМОВЫ І ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ**

6.1. Конкурс праводзіцца з 21 лютага да 25 лютага 2022 года. Удзельнікам конкурсу неабходна прадставіць свае работы на разгляд журы ў тэрмін **з 14 лютага па 18 лютага 2022 года па адрасе: г.Мінск, вул.Адзінцова,10, ДУА ЦТМТДіМ "Зорка", каб. №209.**

6.2. Заяўкі на ўдзел у конкурсе дзіцячай творчасці прымаюцца па ўзоры ў друкаваным і электронным варыянце (**cht@minsk.edu.by** (Дадатак 1);

**7. НАМІНАЦЫІ КОНКУРСУ**

7.1. **"Жывапіс"** (малюнкі беларускага інтэр'ера, пейзажа, нацюрморта і г.д. (работы прадастаўляюцца на лістах фармату А3, афармленыя ў выглядзе карціны: цвёрдая аснова; рамка (без шкла); у верхняй частцы са зваротнага боку – надзейныя завесы для крапяжу);

7.2. **"Тэкстыльны дызайн"** (ткацтва, тэкстыльнае пано, вышыўка, габелен, маляванкі, макаткі, кухонныя вырабы: сурвэткі, абрусы, прыхваткі, ручнікі);

7.3. **"Саломапляценне"** (дробныя і буйныя вырабы з саломкі – да 100 см, якія адлюстроўваюць розныя віды пляцення (не менш за 2); вырабы, інкруставаныя саломкай);

7.4. **"Кераміка"** (дробная пластыка, пано, бытавыя прадметы);

7.5. **"Разьба па дрэве"** (розныя работы з драўніны: прадметы інтэр'ера, кухоннае начынне);

7.6. **"Дэкаратыўная кампазіцыя"** (пано з выкарыстаннем беларускага арнаменту, кампазіцыі з букетаў, вянкі і інш.). Можа выкарыстоўвацца мяшаная тэхніка.

**8. ПАТРАБАВАННІ ДА АФАРМЛЕННЯ**

8.1. Работы павінны суправаджацца інфармацыйнай этыкеткай (кампутарны набор, шрыфт 12 пт.): з указаннем ПІБ аўтара (цалкам), узрост, установа адукацыі, ПІБ кіраўніка (электронны варыянт прыкладаецца);

8.2. Праца павінна мець арыгінальную назву ў адпаведнасці са зместам і намінацыяй;

8.3. Усе працы павінны быць устойлівыя і эстэтычна афармленыя, мець тлумачальную цыдулку (у друкаваным варыянце на ½ - 1 ліст А4).

8.4. Тлумачальная запіска павінна ўключаць:

- намінацыя;
- найменне навучальнай установы, клас (гурток);
- П.І.І. аўтара (-ов) працы, узрост;
- назва і год выканання працы;
- П.І.І. кіраўніка;
- творчае апісанне працы (анатацыя - ½ - 1 стар.).

**9. КРЫТЭРЫ АЦЭНКІ**

- захаванне тэматыкі конкурсу;
- складанасць і якасць выкананай працы;
- яркасць і маляўнічасць;
- неардынарнасць падыходу да раскрыцця творчай задумы;
- арыгінальнасць.

**10. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ**

10.1. Вынікі конкурсу вызначаюцца членамі журы.

10.2. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

10.3. У кожнай намінацыі вызначаюцца тры лепшыя работы згодна з атрыманымі баламі і ўзроставай катэгорыяй.

10.4. Работы пераможцаў на працягу года бяруць удзел у розных выставах раённага і гарадскога ўзроўню.

**11. КАНТАКТНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Усе пытанні аб удзеле ў конкурсе можна задаць па тэлефоне:

017-395-57-74, ці атрымаць поўную кансультацыю па адрасе: г.Мінск, вул. Адзінцова 10, каб. №209. Загадчык аддзялення Навіцкая Наталля Валер'еўна.

**Дадатак 6**

**ПАЛАЖЭННЕ**
**IV конкурсу народнай творчасці “Ойра-2022”**
**(тэатральная творчасць)**

**1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1.1. Конкурс праводзіцца ДУА “Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна г. Мінска “Зорка” і накіраваны на захаванне лепшых традыцый жывога слова і аб’яднанне творчых дзяцей і моладзі.

1.2. Дэвіз конкурсу – “Гучы,беларускае слова!”

**2. ЗАСНАВАЛЬНІКІ КОНКУРСУ**

Упраўленне па адукацыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска, Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна горада Мінска “Зорка”.

**3. МЭТА І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ**

**Мэта:** стварэнне ўмоў для выяўлення і развіцця творчых здольнасцей дзяцей у жанры мастацкага слова.

**Задачы:**

– развіваць і папулярызаваць моўны жанр;
– выхоўваць патрэбнасць у рэгулярным чытанні вершаў, знаёміць са светам айчыннай паэзіі;
– выпрацоўваць уменне трымацца на сцэне перад гледачамі;
– пашырэнне чытацкага кругагляду;
– пошук і падтрымка таленавітай моладзі.

**4. КІРАЎНІЦТВА І АРГАНІЗАЦЫЯ КОНКУРСУ**

Ажыццяўляецца аргкамітэтам Фестывалю. Аргкамітэт мае права змяніць колькасць намінацый у ходзе конкурсу.

**5. ПАРАДАК І ЎМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ**

5.1. Да ўдзелу ў намінацыі конкурса запрашаюцца вучні **I – X класаў** устаноў агульнай сярэдняй, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і ўстаноў культуры г. Мінска, ад установы ў кожнай узроставай катэгорыі не больш аднаго ўдзельніка.

**Пераможцы і прызёры вылучаюцца ў наступных узроставых катэгорыях:**

– 1-я ўзроставая катэгорыя (6-9 год);
– 2-я ўзроставая катэгорыя (10-13 год);
– 3-я ўзроставая катэгорыя (14-18 год);

5.2. Усе ўдельнікі выступаюць з творам (вершам) на беларускай мове па тэме: **“Зямля мая, ты – кніга непрачытаная”.** Працяг выступлення - да 5 хвілін.

5.3. Конкурс праводзіцца **21 лютага 2022 года, у 15.00.**

5.4 Журы конкурсу ацэньвае выступленні ўдзельнікаў у адпаведнасці з наступнымі крытэрыямі:

– глыбіня пранікнення ў вобраз і сэнс твора – ад 0 да 10 балаў;

– выбар тэксту твора – ад 0 да 10 балаў;
– артыстызм выканання – ад 0 да 10 балаў;
– максімальны бал – 30.

5.5. Для ўдзелу ў конкурсе установы адукацыі і культуры падаюць у аргкамітэт заяўку ў электронным і пісьмовым выглядзе ў адпаведнасці з патрабаваннямі, указанымі ў дадатку 1.

У заяўцы ўказваюцца пааднаму ўдзельніку ў кожнай узроставай групе.

Заяўка накіроўваецца ў ДУА “Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна г. Мінска “Зорка” па 16.02.2022 па адрасе: Адзінцова, 10, каб. 210 Загадчык аддзялення Счасная Алена Яугенауна.

**Дадатак 7**



**Дадатак 8**

**Фотагалерэя IV адкрытага фестывалю народнай творчасці “Ойра”-2022**










Раённы конкурс інструментальнага
выканальніцтва ў рамках фестывалю
народнай творчасці
“ОЙРА”


выканальніцтва ў рамках фестывалю
народнай творчасці
“ОЙРА”


Раённы харэаграфічны конкурс
у рамках фестывалю
“ОЙРА”


ЛАДА



